**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ:**

# «НАШЫ АДНОСІНЫ ЗВЯЗАНЫ НЕПАРЫЎНЫМІ ЭКАНАМІЧНЫМІ СУВЯЗЯМІ»

## Вядомы дзяржаўны дзеяч — аб вытоках беларуска-расійскай інтэграцыі, даверы як аснове саюзніцкіх адносін і перспектыўных кірунках супрацоўніцтва з Расіяй

Заўтра беларусы і расіяне адзначаць гістарычную дату — 2 красавіка 1996 года быў падпісаны Дагавор аб стварэнні Супольнасці Беларусі і Расіі, што паслужыла пачаткам глыбокай інтэграцыі дзвюх суверэнных дзяржаў. Каля вытокаў гэтага працэсу знаходзіўся Міхаіл Мясніковіч, які на той час займаў пасаду кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі. На яго вачах прымаліся найважнейшыя рашэнні. Міхаіл Уладзіміравіч асабіста ўдзельнічаў у падрыхтоўцы дакументаў, якія вызначылі будучыню дзвюх краін. Як зараджаўся гэты ўнікальны на сусветнай прасторы саюз, вядомы дзяржаўны дзеяч, доктар эканамічных навук, прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Міхаіл Мясніковіч расказаў у інтэрв'ю карэспандэнту «Звязды».

**— Міхаіл Уладзіміравіч, ці было 30 гадоў таму ў прадстаўнікоў вышэйшага палітычнага кіраўніцтва краіны разуменне, што беларуска-расійскі саюз — гэта ўсур'ёз і надоўга?**

— Тут не было ніякіх экспромтаў, нейкіх эмацыянальных падыходаў. Усё было прадумана і сістэмна. Да гэтага часу ўжо былі прынятыя ключавыя рашэнні, якія вызначалі каркас, архітэктуру беларускай эканомікі і нашых саюзніцкіх адносін. У 1995 годзе адбылася гродзенская нарада, дзе было прынята рашэнне аб захаванні буйнатаварных сельскагаспадарчых арганізацый як асновы харчовай бяспекі нашай краіны і прадмета экспарту. Што да прамысловасці, у наш адрас паступалі рэкамендацыі, у тым ліку ад міжнародных арганізацый, аб немэтазгоднасці існавання такіх буйных аб'яднанняў, як МТЗ, МАЗ, БелАЗ, «Інтэграл». Лічылася, што для сярэднееўрапейскай дзяржавы, якой з'яўляецца Беларусь, дастаткова мець асобную невялікую вытворчасць, бо буйныя нібыта не змогуць выжыць ва ўмовах рынкавых адносін. Аднак на магілёўскай нарадзе па прамысловасці было прынята рашэнне, што буйныя прамысловыя комплексы трэба ўсяляк падтрымаць як тыя, якія могуць забяспечыць вытворчасць канкурэнтаздольнай прадукцыі і сур'ёзна замацавацца на рынку СНД і краін «далёкай дугі». 26 мая 1995 года была ліквідавана граніца паміж Беларуссю і Расіяй, сімвалічна зняты шлагбаум, што сведчыла аб тым, што паміж нашымі краінамі няма ніякай граніцы: ні ў фізічным, ні ў палітычным, ні ў сацыяльным плане. Адбыўся майскі рэферэндум 1995 года, які надаў рускай мове статус другой дзяржаўнай, пацвердзіў эканамічную інтэграцыю з Расійскай Федэрацыяй. Таму да прыняцця дакументаў аб Супольніцтве Беларусь падышла на сістэмнай аснове, прыняўшы адпаведныя ўнутраныя рашэнні і вызначыўшы сваю пазіцыю ў рабоце з галоўным нашым партнёрам — Расіяй.



Фота Лізаветы ГОЛАД

> **Гэта было ўсур'ёз і надоўга.**

**— У той час як Аляксандр Лукашэнка ў Крамлі падпісваў гэты найважнейшы дакумент, у Мінску ішлі пратэсты, накіраваныя супраць кансалідацыі нашай краіны з Расіяй...**

— Пратэстуючыя не выконвалі норм дзеючага заканадаўства. Іх дзеянні былі накіраваны на дэстабілізацыю абстаноўкі ў краіне, разрыў набіраючых сілу канструктыўных шматбаковых адносін з Расійскай Федэрацыяй. Эканоміка Беларусі магла быць разбурана. Усё гэта было на руку нашым ворагам: унутраным і знешнім. Калі адбыўся ўсенародны рэферэндум, на якім былі прынятыя прынцыповыя рашэнні, значыць, іншыя прапановы ўжо не ўпісваюцца ў гэту канву. Дыскусіі могуць быць на стадыі выпрацоўкі рашэнняў. А калі рашэнні прыняты, іх, безумоўна, трэба выконваць. У гэтым моц нацыі. Моц нацыі заключаецца ў яе адзінстве. І калі мы хочам быць моцнымі і паважанымі, то ў нас павінен быць такі кансалідаваны прынцып унутранай і знешняй палітыкі. Пры гэтым вельмі важна, каб рашэнні прымаліся без замежнага ўплыву. Да замежных ідэй і прапаноў можна прыслухоўвацца, іх можна аналізаваць, нешта, можа быць, і ўзяць для далейшай прапрацоўкі. Але беларускі народ, беларускія ўлады і беларуская дзяржава здольныя самастойна прымаць усе неабходныя рашэнні. Наша палітыка фарміруецца за кошт кансалідацыі грамадства, за кошт парады з народам. Пра тое, што ключавыя рашэнні выносяцца на шырокае абмеркаванне, сведчаць усе сем Усебеларускіх народных сходаў.

**— Убіць клін паміж нашымі народамі спрабавалі і падчас падпісання лідарамі Статута Саюза Беларусі і Расіі 23 мая 1997 года. Некаторых прадстаўнікоў расійскага боку, у прыватнасці, не задавальняла, што Саюз засноўваецца на прынцыпе суверэннай роўнасці яго ўдзельнікаў. Ці складана было беларускаму лідару адстойваць незалежнасць і суверэнітэт нашай краіны ў крамлёўскіх кулуарах?**

— Я не магу прывесці такія прыклады, каб на крамлёўскім узроўні былі нейкія пярэчанні. Было поўнае паразуменне. Я ўжо тады працаваў кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і фактычна ўзначальваў беларускую частку. З нашага боку актыўна над Статутам працавалі Сукала Валянцін Алегавіч як міністр юстыцыі, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Абрамовіч Аляксандр Міхайлавіч, наш пасол у Расіі Даніленка Віктар Дзмітрыевіч, Козік Леанід Пятровіч як упаўнаважаны прадстаўнік Прэзідэнта. З расійскага боку над дакументам працавалі Бальшакоў Аляксей Аляксеевіч, Сяроў Валерый Міхайлавіч, Пастухоў Барыс Мікалаевіч. Наша меркаванне не ігнаравалася расійскімі калегамі. Яшчэ калі зараджалася Садружнасць Незалежных Дзяржаў, у расійскіх палітыкаў былі розныя падыходы, як наладжваць адносіны ў рамках СНД. Прапаноўвалася спыніць працэс дэінтэграцыі Савецкага Саюза і развіваць СНД на новых прынцыпах. Была і наступная прапанова: Расія выпрацоўвае сваю эканамічную, палітычную сістэму, а той, хто згодны з гэтай сістэмай, — «калі ласка, прыходзьце, сядайце з намі за стол перагавораў, і мы будзем з вамі размаўляць». Перамог першы падыход. Пачалі падпісвацца дамовы непасрэдна аб роўных партнёрскіх адносінах. Так было і тады, калі распрацоўваўся праект Статута Саюза Беларусі і Расіі.

**— Дакумент аб расійска-беларускай супольнасці спарадзіў яшчэ адзін такі магутны рух, як рэгіянальныя эканамічныя сувязі...**

— Нашы рэгіёны і раней сябравалі, супрацоўнічалі з расійскімі рэгіёнамі, але гэта ў асноўным былі гуманітарныя кантакты. А вось калі мы сталі выбудоўваць глыбокія адносіны, прамкааперацыю з Расійскай Федэрацыяй, то прыярытэтам рэгіянальных кантактаў стала эканоміка.

> **За 30 гадоў узаемны тавараабарот вырас у восем разоў і летась склаў каля 55 мільярдаў долараў.**

Калі паглядзець на яго структуру, то больш за 50 % — гэта прамежкавыя тавары, якімі ў далейшым забяспечваюцца эканамічныя перадзелы, гэта значыць вытворчасць: сыравіна, камплектацыя і гэтак далей. Спажывецкія тавары ў нашым узаемным тавараабароце складаюць каля 30 % і дзесьці 11—12 % — інвестыцыйныя тавары. Гэта сведчыць аб тым, што ўзаемнае пранікненне эканомік нашых дзяржаў вельмі магутнае. І ў тым ліку дзякуючы рэгіянальным сувязям, беларуска-расійскае супрацоўніцтва атрымлівае развіццё і ўмацаванне. Нашы адносіны звязаны непарыўнымі эканамічным сувязямі. Умацоўваецца ваеннае супрацоўніцтва, валютны саюз, развіваецца парламенцкае вымярэнне. Захаваны самыя галоўныя прынцыпы расійска-беларускіх адносін — роўныя ўмовы гаспадарання і роўныя правы грамадзян. Гэта аснова, якая была прапанавана кіраўніком нашай дзяржавы. Адкрываюцца новыя цікавыя кірункі. Гэта добра, бо Саюз Беларусі і Расіі — жывы арганізм.

**— Беларуска-расійскае партнёрства грунтуецца на добрых, сяброўскіх адносінах двух лідараў. У чым сакрэт таго, што ў Аляксандра Лукашэнкі з усімі прэзідэнтамі Расійскай Федэрацыі складваліся і складваюцца блізкія адносіны?**

— Адносіны лідараў Беларусі і Расіі — узор узаемнага даверу, які правераны гадамі. Калі партнёр бачыць, што гэтыя адносіны шчырыя, носяць доўгатэрміновы характар, не з'яўляюцца нейкімі кан'юнктурнымі, то мае права разлічваць і на пэўную ўзаемнасць. Наш лідар і ў прынцыпе краіна заўсёды выконваюць усе абавязацельствы, якія бяруць на сябе. Кіраўнік дзяржавы арыентуе: калі паабяцаў, аддай апошняе, але выканай. І калі гэта дэманструецца на самым верхнім узроўні, то будуць і павага, і давер.

> **Гэта самае галоўнае ў пытаннях інтэграцыі — палітычнай, эканамічнай ці ваеннай. Калі ёсць давер, будзе і поспех.**

**— Якімі бачацца перспектывы інтэграцыі Беларусі і Расіі, улічваючы ўсё большы ціск на нашы краіны і ў цэлым міжнародную абстаноўку?**

— Нягледзячы на тое, што дзесьці нам ствараюць пэўныя складанасці, гэта ні ў якім разе не адбіваецца на абраным намі шляху — сяброўстве і супрацоўніцтве з Расійскай Федэрацыяй. На ўсіх узроўнях і па ўсіх кірунках: палітычным, эканамічным, ваенна-стратэгічным, валютным, навуковым, у цэлым гуманітарным. З улікам кампетэнцый, якія ёсць, актуальны і шэраг іншых кірункаў. Трэба працаваць над павышэннем канкурэнтаздольнасці беларускіх тавараў і паслуг, іх якасці. Могуць быць запатрабаваны новыя інтэграцыйныя праекты, сумесныя акцыянерныя кампаніі. Мы маглі б больш актыўна пазіцыянаваць сябе на рынку машынабудавання, электронікі і гэтак далей. Ёсць адпаведныя кампетэнцыі ў беларусаў, ёсць у расіян. Трэба аб'яднаць намаганні для таго, каб сумесна рабіць аэробусы, іншае. Я маю на ўвазе стварэнне транснацыянальных кампаній. Пытанняў дастаткова, каб рэалізоўваць задачы для ўмацавання нашых саюзных адносін.

> **Мудрасць палітычнага кіраўніцтва нашай краіны ў тым, што мы бачым вялікія перспектывы ва ўзаемадзеянні з краінамі Паўднёва-Усходняй Азіі, афрыканскімі дзяржавамі. Але супрацоўніцтва з Расіяй — гэта прыярытэт.**

**Матэрыялы падрыхтавала Вераніка КАНЮТА**